Але педпрактыка толькі тады можа стаць эфектыўным сродкам падрыхтоўкі да педагагічнай дзейнасці, калі ў студэнта ёсць жаданне і імкненне стаць добрым педагогам, калі ён свядома арганізуе працэс сваёй прафесійнай самаадукацыі і самавыхавання, калі ён разумее сваю адказнасць за адукацыю і выхаванне падрастаючага пакалення.

Такім чынам, умовамі эфектыўнасці правядзення педпрактыкі студэнтаў універстэта культуры з'яўляюцца:

1. Дакладнае ўяўленне агульных і паэтапных задач педпрактыкі.

2. Арганізацыя практыкі і дапамога студэнту на працягу практыкі.

3. Неабходнасць тэарэтычнай падрыхтоўкі студэнтаў да практыкі.

4. Актуалізацыя значнасці педпрактыкі для далейшай прафесійнай дзейнасці студэнта ў сацыякультурнай сферы.

Э.С.Суддзя,
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

## ВЫТВОРЧАЯ ПРАКТЫКА — ЧАСТКА ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ГУМАНІТАРНАГА ПРОФІЛЮ ФБІС

Мадэль практыкі — гэта сістэма дзеянняў і ўзаемадзеянняў студэнтаў, выкладчыкаў, чытачоў бібліятэкі, накіраваных на фарміраванне суб'ектнасці будучага бібліёграфа-бібліятэкара. Сістэма ўзаемадзеянняў, напрыклад, імітуе сутнасць структуры бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці ў гуманітарных галінах, а таксама ўмовы аптымальнага развіцця ўдзельнікаў бібліяграфічнага працэсу (у першую чаргу асобаснага, прафесійнага развіцця студэнтаў).

Метадалагічнай асновай мадэлі вытворчай практыкі студэнтаў нашай ВНУ ў гэтым выпадку становіцца канцэпцыя фарміравання будучага бібліятэкара-бібліёграфа, яго



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суб'ектнасці. Суб'ектнасць бібліятэкара-бібліёграфа — гэта здольнасць ператвараць уласную жыццядзейнасць, бібліяграфічную работу ў прадмет практычнага пераўтварэння, удасканалення. Сутнаснымі ўласцівасцямі гэтага працэсу з'яўляюцца: здольнасць кіраваць сваімі дзеяннямі, практычна пераўтвараць рэчаіснасць, самога сябе і чытача (карыстальніка), мадэліраваць, планаваць спосабы дзеянняў самога бібліёграфа і карыстальніка, спосабы ўзаемадзеяння, рэалізоўваць намечаныя праграмы, кантраляваць ход і ацэньваць вынікі сваіх дзеянняў. Інтэграваны крытэрый суб'ектнасці бібліёграфа-галінавіка — яго гатоўнасць да прафесійнай дзейнасці ў пэўнай галіне або іх сукупнасці.

Такая гатоўнасць з'яўляецца цэласным утварэннем, інтэгрыраванай уласцівасцю асобы бібліёграфа-галінавіка, сістэмай яе якасцей, якія забяспечваюць стварэнне ўмоў развіцця гуманітарных ведаў карыстальніка бібліятэкі.

Можна меркаваць, што вытворчая практыка фарміруе студэнта паступова, пераводзячы з аднаго этапу на другі. На першым этапе адбываецца ўсведамленне студэнтам сваёй значнасці ў працэсе адукацыі. Сінтэзуючы веды па прадметах гуманітарнага і бібліятэчна-бібліяграфічнага цыклаў, знаёмячыся з праграмай вытворчай практыкі, студэнт атрымлівае магчымасць вызначыць кола суб'ектаў бібліяграфічнага працэсу, функцыі бібліяграфічнай працы па галіне, яе структуру, арыентацыю ў будучай прафесійнай дзейнасці. На другім этапе адбываецца самаідэнтыфікацыя студэнта з рознымі мадэлямі бібліяграфічнай дзейнасці, вызначэнне будучым бібліёграфам сваёй тыпалогіі. На трэцім этапе — узгадаванне індывідуальнай бібліяграфічнай тэхналогіі, дзейнаснага падыходу да зносін з карыстальнікамі інфармацыі па галіне або іх сукупнасці.

Вынікам вытворчай практыкі студэнтаў ФБІС павінен стаць, на мой погляд, акмеалагічны падыход да ўласнай прафесійнай падрыхтоўкі па гуманітарным цыкле і імкненне стымуляваць у спажыўцоў інфармацыі, карыстальнікаў бібліятэкі фарміраванне аналагічнага падыходу і да сваёй дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Менавіта вытворчая практыка разам з працэсам самаадукавання пабуджае кожнага студэнта да дасягнення пэўнага ўзроўню майстэрства ў сваёй будучай прафесійнай дзейнасці, жаданне стаць кампетэнтным спецыялістам. Асабліва ўзрасла роля падобнага пасылу ў апошнія гады, калі імкненне скараціць аб'ём гадзін галіновых бібліяграфічных курсаў стала амаль надакучлівай ідэяй некаторых распрацоўшчыкаў новых планаў прафесійнай адукацыі. Студэнты пры гэтым пазбаўляюцца магчымасці набыць неабходныя веды ў аўдыторных умовах, з прычыны чаго павышаецца роля самастойных метадаў далучэння да ведаў і навыкаў у іншых умовах, у тым ліку і праз вытворчую практыку.

Як паказалі даследаванні і апытанні, сярод студэнтаў ФБІС пераважаюць тры ўзроўні матывацыі і самаарганізацыі на будучую працу: першы, даволі прымітыўны ўзровень развіцця інтэгратыўных якасцей у студэнтаў прымушае складальнікаў праграмы вытворчай практыкі закладваць у яе заданні для абавязковага выканання, з абсалютным капіраваннем. Тут ініцыятыва ў набыцці неабходных навыкаў студэнтамі зыходзіць ад кіраўніка практыкі (прадстаўніка універсітэта ці бібліятэкі); другі ўзровень матывацыі прадугледжвае магчымасць для самастойнай дзейнасці ў працэсе падрыхтоўкі канкрэтных бібліяграфічных заданняў. Тут роля кіраўніка практыкі абмяжоўваецца парадамі і рэкамендацыямі пры індывідуальных зносінах з кожным студэнтам; трэці ўзровень азначае, што студэнт здольны сам рыхтаваць і праводзіць бібліяграфічныя дзеянні.

Зыходзячы з гэтага, у праграму практыкі закладзены заданні, якія прапаноўваюць абавязковае кола ведаў і навыкаў, сярэдні і вышэйшы ўзровень іх развіцця. На двух апошніх узроўнях мэтазгодным стала ўключэнне заданняў па тэорыі літаратуры і мастацтва. Для студэнта ФБІС важна набыць веды не толькі па гісторыі літаратуры і мастацтва, але і па тэорыі, гэта значыць такую якасць ведаў, якая б забяспечыла яму ў будучай прафесійнай дзейнасці магчымасць разбірацца ў праблемах літаратуры і мастацтва, выз-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

начаць эстэтычную, мастацкую каштоўнасць незнаёмага мастацкага твора. Падобная каштоўнасная арыентацыя ўключае студэнта ў сістэму сацыяльных кумунікацый больш актыўна і дзейнасна.

Сацыялагічныя даследаванні апошніх гадоў, вынікі ўступных экзаменаў у ВНУ, выступленні ў друку бібліёграфаў, сацыёлагаў, выкладчыкаў, бацькоў утрымліваюць трывогу наконт таго, што сярод моладзі заўважаецца адчужэнне ад класікі і чытання наогул. Моладзь часцей аддае перавагу нізкапробным баевікам і "мыльным операм" на экранах тэлевізараў і відэа, а не высокаму мастацтву. Таму адным з галоўных арыенціраў сістэмна-кантэкстнага мадэліравання зместу вытворчай практыкі з'яўляецца інтэлектуальнае станаўленне студэнтаў як самастойных прафесіяналаў, для бібліёграфаў-гуманітарыяў дабаўляецца яшчэ камунікатыўная накіраванасць дзейнасці ў вызначанай галіне. У эстэтычна адукаванага чалавека не проста павялічваецца запас ведаў (напрыклад, аб літаратурна-мастацкіх накірунках, стылях, школах, жанрах і інш.), а паглыбляецца духоўны лад або фарміруюцца тыя ці іншыя прыватныя, спецыяльныя ўменні і навыкі (напрыклад, уменне аналізаваць слоўны тэкст пры стварэнні аналітычных і аглядных бібліяграфічных прадуктаў).

Даволі частыя папрокі практыкаў ў тым, што ВНУ не вучыць успрымаць мастацтва на ўзроўні творцы. Нават найстаражытнейшае з мастацтваў — літаратура — не выкладаецца як мастацтва. Слоўна-мастацкая творчасць асвятляецца галоўным чынам у гісторыка-генетычнай плоскаці як больш ці менш непасрэднае адлюстраванне грамадска-гістарычных падзей і заканамернасцей. У выніку гэтага студэнты лепш разбіраюцца ў канкрэтна-гістарычных аспектах літаратурнай класікі, чым адчуваюць і перадаюць яе пазачасавую сутнасць, каштоўнасць і сучасны сэнс. Менавіта студэнты, прыходзячы на практыку ці на працу, вымушаны развіваць сістэмныя якасці свайго мыслення самастойна. Недахоп выкладання прадметаў мастацтвазнаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чага і літаратуразнаўчага цыклаў адчуваецца і пры чытанні курсаў "Бібліяграфія мастацтва" і "Бібліяграфія мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства". Малаверагодна, што гэта можна ліквідаваць у працэсе вытворчай практыкі.

У выніку вытворчай практыкі студэнт нашага факультэта шліфуе пазнавальныя, камунікатыўныя, прадметна-практычныя бакі сваёй прафесійнай дзейнасці.

А.І.Сцепанцоў,
прарэктар Беларускага інстытута праблем культуры

## ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СІСТЭМЕ МАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ

Мастацкая адукацыя з’яўляецца часткай агульнай сістэмы адукацыі краіны. У агульнаадукацыйнай школе прадметы мастацкага цыкла з’яўляюцца арганічнай часткай праграмы і садзейнічаюць гарманізацыі вучэбнага працэсу. Дадаткова дзеці могуць наведваць дзіцячыя школы мастацтваў, якія даюць паглыбленыя веды па розных відах мастацтваў, рыхтуюць да паступлення ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы мастацтваў. Музычныя, мастацкія, харэаграфічныя каледжы, вучылішчы — асноўнае звяно прафесійнай адукацыі спецыялістаў мастацтва і культуры. Яны рыхтуюць моладзь для практычнай дзейнасці ў сферы культуры, а таксама для працягу навучання ў вышэйшых навучальных установах мастацтва і культуры. На вышэйшым узроўні адукацыі адбываецца пэўнае авалодванне комплексам ведаў, уменняў і навыкаў, дастатковых для самастойнай практычнай дзейнасці ў мастацтве, выпускнік актыўна праяўляе сябе як творчая асоба.

Змест мастацкай адукацыі вынікае з сутнасці мастацтва і вызначаецца пэўнымі яго відамі. Мастацтва фарміруе душэўны і эмацыянальны свет чалавека, аказвае значны ўплыў на яго праз яркую вобразнасць і метафарычнасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ